**Использованная литература**

1. Конституция Российской Федерации: принята всенародным голосованием 12 дек. 1993 г.: офиц. текст. – М.: Юрист, 2005. – 56 с.

2. Рыбаков В.А. К вопросу о роли идеологии в современном государстве.- [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.omsu.omskreg.ru. (дата обращения 07.03.2008).

3. Величко В.П. Нужна ли обществу идеология? / В.П. Величко// Беларуская думка. – 1996. - № 5. – С. 18-32.

4. Бондарь П.И. Тесты по политологии/ П.И. Бондарь. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2001. – 175 с.

5. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2007. – 63 с.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ГАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ БДУ

Яноўская В. В. г. Мінск, ІГ НАНБ
Яноўскі А. А. г. Мінск, БДУ

У кантэксце праблемнага поля канферэнцыі натуральным падаецца ўзгадаць абставіны разгортвання ў Беларусі падрыхтоўкі спецыялістаў у вобласці айчыннай гісторыі. Зразумела, першасная прафесійнасць набывалася праз вучобу ва ўніверсітэце, у БДУ. Ужо з 1922 г., калі быў створаны педагагічны факультэт, на яго сацыяльна-гістарычным аддзяленні і сталі рыхтаваць якраз гісторыкаў. Больш за тое — на педфаку была магчымасць (і неабходнасць) адпрацоўваць усё новыя і новыя падыходы ў падрыхтоўцы як гуманітарыяў, так і прыродазнаўцаў. Яны першнаперш знаходзілі ўвасабленне ў вучэбных планах, якія перманентна абнаўляліся ў сілу розных акалічнасцяў — кадравых, метадычных, метадалагічных, палітычных і інш. У 1927 г. рэктар У. І. Пічэта ўрачыста мог адзначыць, што «Праўленьне Ун-ту павяло вялікую работу па распрацоўцы новых навучальных плянаў Пэдфаку з тым , каб гэтыя пляны былі сталымі ў працягу наступных

5 год. Гэта справа была выканана з вялікім поспехам, і пляны Ун-ту былі зацьверджаны Галоўпрафасьветы БССР» [1, с. 18].

За некалькі гадоў быў пройдзены цяжкі шлях стварэння і практычнай рэалізацыі ў навучальным працэсе такіх планаў і праграм, якія дазвалялі падрыхтаваць сапраўдных знаўцаў гісторыі, а адначасова па іншых спецыяльнасцях гуманітарнага профілю прасунуць багаты беларусазнаўчы цыкл дысцыплін. Аб гэтай рабоце можна даведацца з як бы справаздач за першыя годы дзейнасці БДУ, з якімі да грамадскасці Беларусі звярнуліся адны з першых арганізатараў БДУ – Ф.Ф. Турук і С.З. Кацэнбоген. У універсітэцкім навуковым часопісе «Працы БДУ» яны падалі падрабязныя звесткі аб праблемах і поспехах у арганізацыі навучальнага працэса ў 1919–1923 гг.

Можна лічыць, што вучэбныя планы сталі распрацоўваць амаль што адразу пасля лютаўскага рашэння беларускіх улад аб стварэнні БДУ. Ужо пасля 24 лютага 1919 г. імі сталі займацца прадстаўнікі Мінскай і Маскоўскай камісій па арганізацыі першага беларускага ўніверсітэта. Меркавалася адкрыць пяць факультэтаў. Важнай праблемай было стварэнне такіх вучэбных планаў, якія б маглі быць не толькі забяспечаны і рэалізаваны кадрамі адпаведнай высокай кваліфікацыі, але і адпавядалі «новому содержанию и новым методам реформируемой высшей школы России и сообразно особенностям и культурным нуждам местной жизни Белоруссии <...>» [2, с. 182]. Тым больш, што тады браўся курс на ўвасабленне на ўсіх узроўнях адукацыі ідэі «працоўнай школы», а новае Палажэнне аб вышэйшых навучальных установах РСФСР, прынятае 3 ліпеня 1922 г., увогуле скіроўвала на «привлечение к делу строительства высшей школы широкой пролетарской общественности в лице партийных, советских и профессиональных органов, как и вовлечение студенчества в сложный аппарат университетской работы» [3, с. 231].

Адкрыты восенню 1921 г. БДУ складаўся ўсяго з двух факультэтаў, на якіх распачалася менавіта вышэйшая адукацыя. І адным з іх стаў факультэт грамадскіх навук (ФГН). Такое ж «прызямленне» адбылося і ў адносінах да вучэбных планаў. Спачатку меркавалася студэнтам прачытаць шэраг дысцыплін беларусазнаўчага сэнсу (на этнолага-лінгвістычным, прававым і на эканамічным аддзяленнях і асабліва на грамадска-педагагічным

аддзяленні ФГН): дакладна «гісторыя Беларусі», а таксама — «гісторыя беларускай культуры», «гісторыя народнай гаспадаркі Беларусі», «гісторыя этнаграфіі народаў Беларусі», «гісторыя рэлігійных рухаў у Беларусі», «археалогія Беларусі», «архівазнаўства» і нават «гісторыя галоўных відаў прамысловасці ўвогуле і ў прыватнасці ў Беларусі». Патрэбна звярнуць увагу на тое, што адначасова падобныя курсы прапаноўваліся студэнтам і да вывучэння ў рэчышчы расіязнаўства. У той жа час планавалася прачытаць і такія асобныя курсы, як «гісторыя Украіны» і «гісторыя Польшчы». Больш за тое, у падтрымку падобнага плана навучання меркавалася стварыць пры БДУ спецыяльны «Навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культур» для «изучения особенностей белорусского и еврейского народов, составляющих преобладающую массу населения Белоруссии» [2, с. 186–188, 193–194, 199].

Як вядома, такі інстытут (Інстытут беларускай культуры) быў створаны, але як асобная ўстанова, хаця значная частка выкладчыкаў БДУ сталі актыўнымі яго супрацоўнікамі. Між тым падобны штучна ўтвораны ведамасны разрыў вышэйшай адукацыі і вышэйшай навукі не прыносіў неабходнага плёну якраз і ў справе падрыхтоўкі новага пакалення спецыялістаў, і ў справе правядзення гістарычных даследаванняў, і ў справе іх абагульнення ў выглядзе сінтэтычных прац, падручнікаў. Яго не магла ліквідаваць і актыўная дзейнасць Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў, пасутнасці стаўшае арганічнай часткай Навуковага таварыства БДУ. Гарачыя дыскусіі, якія рэгулярна адбываліся на пасяджэннях гэтых суполак, як і крыху пазней у Краязнаўчым таварыстве БДУ, садзейнічалі знаходжанню адказаў на безліч навуковых пытанняў, у т. л. у вобласці айчыннай гісторыі. Але яны знаходзіліся ў баку ад вырашэння абсалютна прагматычнай праблемы па стварэнню падручнікаў і іншай навучальнай літаратуры. Не было (крыху пазней) вялікага прыбытку і ад дзейнасці з'яднання «гісторыкаў-марксістаў» з іх больш палітычнымі амбіцыямі, цкаваннем, чым паўсядзёнасцю прафесійнай працы. Тут надзея была толькі на ініцыятыўнасць саміх выкладчыкаў, на асабістыя здольнасці і адказнасць перад студэнтамі.

У рэальнасці першы вучэбны год распачаўся інакш, чым так доўга і натхнёна планавалі бацькі-заснавальнікі ўніверсітэта. Элементарна адсутнічаў неабходны кадравы патэнцыял, каб можна

было звярнуцца да студэнтаў з «шматвектарнымі» лекцыйнымі курсамі. Так, да пачатку дзейнасці БДУ ў спісе яго першых прафесараў «по кафедре истории Белоруссии» быў названы толькі Ф. Ф. Турук; «по кафедре русской истории» – У. І. Пічэта, Д. А. Жарынаў і А. А. Савіч; «по кафедре всеобщей истории» – У. М. Перцаў і М. М. Нікольскі [2, с. 203].

Згадаем, што на той час кафедра як структурная вучэбна-арганізацыйная і навуковая адзінка не прадстаўляла сабой падабенства да сучаснай, бо была ўсяго толькі ўвасабленнем наяўнасці прафесара ці дацэнта, якія маглі чытаць пэўныя курсы і праз іх пазначалі кафедральны профіль-назву. Кафедральныя турботы на той час былі сканцэнтраваны ў дзейнасці прадметных камісій, якія складваліся амаль што з усіх наяўных прафесараў і дацэнтаў. На тым жа ФГН сярод пяці прадметных камісій з кастрычніка 1921 г. дзейнічала і Камісія па прадметах гістарычных у складзе прафесараў-гісторыкаў У. М. Дзьякава (старшыня, гісторык-антыказнаўца), Д. П. Канчалоўскага, У. І. Пічэты, У. М. Перцава, У. М. Ігнатоўскага, Ф. Ф. Турука, Д. А. Жарынава, М. М. Нікольскага, А. А. Савіча і прафесара-філосафа С. Я. Вальфсона. У многім намаганнямі Камісіі быў сабраны адмысловы камплект навуковай і вучэбнай літаратуры для «аддзела беларусазнаўства» у складзе ўніверсітэцкай бібліятэкі: закуплены кніжныя зборы асоб, непасрэдна меўшых адносіны да беларускай зямлі і збіраўшыя пісьмовыя крыніцы па яе гісторыі, культуры, пісьменнасці: В. Л. Дыла, прафесараў П.М. Жуковіча, Я.Ф. Карскага і М.А. Янчука, былога апекуна Віленскай вучэбнай акругі І.П. Карнілава, віцебскага краязнаўцы і выдатнага даследчыка беларускай гісторыі А. П. Сапунова. Адзначалася, што кнігі з бібліятэкі апошняга «обогатили» бібліятэку БДУ, асабліва работы па гісторыі Віцебшчыны і Полацка, а галоўнае – «первоклассная библиографическая редкость – 1-е издание Статута Литовского». Была набыта нават частка бібліятэкі Я. Купалы, якая «значительно пополнила Белорусский отдел рядом изданий по вопросам белорусоведения». [2, с. 210, 212; 3, с. 272].

Але ў рэальнасці першы навучальны год БДУ быў самым складаным. Нездарма двойчы ставілася пытанне (не ў Мінску, а ў Маскве) аб закрыцці беларускага ўніверсітэта. Але ён выстаяў. І ў яго сценах па-сапраўднаму стала разгортавацца вывучэнне

айчыннай гісторыі. За першы навучальны год на ўсіх (!) аддзяленнях ФГН на працягу двух семестраў быў прачытаны курс «Гісторыя Беларусі». Яго змог падрыхтаваць і прадставіць студэнтам наркам адукацыі У. М. Ігнатоўскі. Ён вылучыў тры перыяды беларускай гісторыі: «Полацкі», «літоўска-беларускі» і «польскі». Адначасова з праслухоўваннем лекцыйнага курса студэнты ўсіх аддзяленняў факультэта грамадскіх навук пад кіраўніцтвам Ф. Ф. Турука на практычных занятках вывучалі «областные привилеи», а «шляхетские привилеи» разбіралі без выкладчыка і выконвалі аналітычныя пісьмовые работы [4, с. 336–337].

І тут патрэбна заўважыць, што выкладанню на гэтым факультэце расійскай гісторыі было адведзена значна больш часу. Так, А.А. Савіч на грамадска-педагагічным аддзяленні за тыя ж два семестры прачытаў курс гісторыі Маскоўскай дзяржавы XVI–XVII стст., а на практычных занятках са студэнтамі разбіраў гістарычныя крыніцы часоў Смуты і абавязваў іх напісаць тры самастойныя работы. Рэктар У. І. Пічэта на эканамічным і прававым аддзяленнях акрамя курса «гісторыя гаспадаркі Беларусі» прачытаў курс «гісторыя народнай гаспадаркі за першую палову XIX ст. у Расіі», а на этнолага-лінгвістычным – «гісторыя рускай культуры» (адначасова і курс «гісторыя яўрэяў Літвы і Польшчы»). Прафесар Д.А. Жарынаў для будучых эканамістаў і правазнаўцаў чытаў цыкл лекцый «навейшая гісторыя Расіі ад XIX ст. да Кастрычніцкай рэвалюцыі», а будучым педагогам – «гісторыя Расіі XIX ст. (да рэформы 1861 г.)».

Другі навучальны год быў распачаты ў БДУ больш сістэмна і прадумана ў адносінах да логікі выкладання курсаў у залежнасці ад дакладных факультэтаў і спецыяльнасцей. Аб гэтым сведчыла і адкрыццё асобнага педагагічнага факультэта, вылучанага з ФГН і дапоўненага студэнтамі так і не стаўшага на ногі Мінскага настаўніцкага інстытута.

Пазбегнуць гіпертрафіраванай па аб’ёму вучэбных гадзін расійскай гісторыі было нельга і ў сувязі з наяўнасцю адпаведных знаўцаў якраз агульнарасійскай праблематыкі і па палітычных матывах. Сітуацыя дастаткова хутка змянялася. Цікава азнаёміцца з гістарычнымі курсамі, якія былі прачытаны студэнтам ФГН і педфака ў 1922–1923 навучальнам годзе. Так, У. М. Ігнатоўскі

працягнуў свой курс «Гісторыі Беларусі» для студэнтаў эканамічнага і правазнаўчага аддзяленняў, але прафесар удакладніў храналагічныя рамкі сваіх лекцый — XIX і XX стагоддзі. Ім жа ён чытаў курс «Гісторыя беларускай культуры».

У сваёй справаздачы за дадзены год прафесар-беларусіст і беларускі наркам асветы караценька пазначыў: «<…> прочел курс истории Беларуси нового времени. Курс доведен до 80-х годов 19 в., проработан и издан типографически. Дальнейшая обработка намечена на будущую зиму <...>. Неодгократно читались доклады на темы: «Основные принципы трудовой школы и метод родиноведения», «Анализ белорусского движения». Праўда, сам прафесар, загружаны наркаматаўскімі абавязкамі, не заўсёды мог быць дысцыплінаваным як выкладчык. І яго што раз падмяняў на той час яшчэ толькі асістэнт Васіль Данілавіч Дружчыц, які ў сваёй справаздачы за гэты ж самы навучальны год мімаходзь адзначыў, што ім «Прочитана почти половина курса Истории Белоруссии по поручению проф. В. М. Игнатовского»<…> вёл просеминарий по Истории Белоруссии. Темой для занятий был взят социальный строй общества в период существования Литовско-Белорусского государства. Студентами написано до 25 рефератов».

Побач з У. М. Ігнатоўскім «Гісторыю народнай гаспадаркі ў Беларусі (аграрныя адносіны)» выкладаў У. І. Пічэта, на педфаку ён вёў семінарый па агульнай гісторыі Беларусі, а на прававым аддзяленні ФГН — прасемінарый «Гісторыя рускага і беларускага права». А курс этнаграфіі Беларусі на двух гуманітарных аддзяленнях педфака стаў чытаць прафесара І. А. Сербаў.

У той жа час прафесары А. А. Савіч і Д. А. Жарынаў на названых двух факультэтах па агульнай расійскай гісторыі і гісторыі асобных яе перыядаў выкладалі больш за 10 лекцыйных курсаў, праводзілі шмат семінарыяў і прасемінарыяў па дакладных праблемах (напрыклад, «Гісторыя Расіі XVIII ст.», «Гісторыя Расіі XIX ст.», «Навейшая гісторыя Расіі», «Палажэнне 19 лютага 1861 г.», «Чытанне і тлумачэнне Наказа Кацярыны II» і інш.). Менавіта іх намаганнямі (у першую чаргу А. А. Савіча) на педфаку запрацаваў на першым годзе яго дзейнасці першы вучэбны кабінет – рускай гісторыі, але з асобным аддзелам гісторыі Беларусі, які праз кароткі час адасобіўся ў поўнавартасны кабінет са зборам літаратуры па беларусістыцы. І толькі потым былі створаны яшчэ шэсць іншых

вучэбных кабінетаў (сярод іх – усеагульнай гісторыі і гісторыі рэлігіі). Дарэчы, той жа А. А. Савіч, па свайму паходжанню беларус, хаця яго навуковае сталенне прайшло ў расійскіх навукова-адукацыйных цэнтрах, стаў весці курс не толькі «Культурных рухаў Расіі XVI ст.», але і «Культурных рухаў Беларусі». Вось толькі такая высокая кваліфікацыя не дапамагла яму ўтрымацца ў БДУ і Беларусі: ужо ў 1924 г. Агітпроп беларускага Бюро ЦК РКП прапанаваў намесніку У. І. Пічэты С. З. Кацэнбогену «удалить из университета» Савіча [5, арк. 60]. Заўважым, што гэтае рашэнне ў дачыненні да прафесара, якое вымушаны былі прыняць калегі па ўніверсітэту, па-сутнасці дазволіла Аляксандру Антонавічу ў далейшым пазбегнуць значна больш жорсткіх “выхаваўчых мер” з боку ўлад, бо «непралетарскую» біяграфію і відавочны «немарксізм» гісторыку-беларусу было цяжка схаваць за сваім прасавецкім канфармізмам у прафесійнай дзейнасці.

Адначасова расіязнаўцы вялі шырокую папулярызатарскую дзейнасць сярод беларусаў, далучаючы іх да відавочных і патаемных куткоў расійскай гісторыі. А прафесар Д. А. Жарынаў яшчэ праслыў і выдатным метадыстам – ён не толькі мог сабе дазволіць дэталёва разбіраць на занятках з беларускімі студэнтамі кнігу асуджанага на высылку былога члена Часовага ўраду гісторыка М. А. Ражкова «Город и деревня в русской истории» 1902 года выдання, але і на прыкладах той жа расійскай гісторыі пашыраць кваліфікацыю настаўніцтва розных школ Беларусі. Так, ім быў прачытаны шэраг лекцый для настаўнікаў Барысава, Бабруйска, Гомеля, Мінска на такія тэмы, як «Западничество и славянофильство в истории русской интеллигенции», «Хрестоматия и книга для чтения по истории в работе средней школы», «Дискуссионный метод как элемент преподавания в современной школе», «9 января как народная победа» і інш. Засваенне наступстваў прыхільнасці да «вялікадзяржаўнага шавінізму» наступіць крыху апасля, праз некалькі гадоў.

Патрэбна заўважыць, што пытанням методыкі выкладання адразу стала надавацца вялікае значэнне, бо савецкая школа (і пачатковая, і сярэдняя, і вышэйшая) спрабавала выйсці на нейкі іншы, рэвалюцыйны шлях свайго развіцця. Савецкая школа была прызвана рыхтаваць зусім іншых, у адрозненне ад мінулых часоў, дасведчаных, прафесійных і ідэалагічна загартаваных маладых

людзей. Савет БДУ, саветы факультэтаў, прадметныя камісіі рэгулярна абмяркоўвалі праблемы метадаў і форм выкладання. Напрыклад, для студэнтаў першага выпуску педфака напрыканцы іх вучобы да педагагічнага практыкума дадалі яшчэ кароткі прафесійны практыкум. Так што можна лічыць, што 42 выпускнікі гістарычнага аддзялення змаглі набыць неабходныя якасці педагога ў дадатак да ведання гістарычнага наратыву і логікі развіцця гісторыі [6, с. 332].

У прапазіцыях на другі навучальны год дзейнасці БДУ быў зафіксаваны і курс «Гісторыя Расіі ХХ ст.» С. А. Піанткоўскага – маладога маскоўскага гісторыка, імкліва набіраўшага аўтарытэт сярод прыхільнікаў «школы» М. М. Пакроўскага [4, с. 343, 353–357; 3, с. 237–239, 245, 249–251]. Вось толькі пакуль не ўдалося высветліць ці быў гэты важны ў ідэалагічным сэнсе курс прачытаны беларускім студэнтам эканамічнага аддзялення факультэта грамадскіх навук. Аднак логіка, якой, мабыць, перш за ўсіх кіраваўся рэктар У. І. Пічэта відавочная: расійскую гісторыю студэнты-беларусы павінны былі паслядоўна ў храналагічнай заданасці спасцігаць праз дасведчаннасць спецыялістаў: А. А. Савіч спецыялізаваўся на гісторыі Расіі XVI–XVIII стст., Д. А. Жарынаў быў вядомы знаўца расійскай гісторыі XIX ст., а вось С. А. Піанткоўскі як гісторык новага савецкага гарту павінен быў данесці студэнтам логіку рэвалюцыйных перетрусаў пачатку ХХ ст. Старажытная гісторыі Русі натуральна (па канцэпцыі М. М. Пакроўскага) выпадала з гэтай паслядоўнасці. А між тым беларускую гісторыю імкнуліся падаць як мага больш паслядоўна, закранаючы ўвесь храналагічны шлях і імкнучыся звярнуць увагу студэнтаў на як мага большую тэматычную разнабаковасць.

Распавядаючы аб праблематыцы выкладання беларускай гісторыі ў БДУ (па-сутнасці, у маштабах усёй Беларусі) нельга не закрануць увогуле тэму беларусізацыі. Яна шматбаковая, як бы першасна ўспрымаецца з боку і асабістых імкненняў пэўнай часткі ўніверсітэцкай супольнасці выкладаць і слухаць па-беларуску, і афіцыйных установак (маскоўскіх і мінскіх) гэта рабіць абавязкова. Вось толькі рэалізацыя беларусізацыі мела зашмат «падводных рыфаў», аб якіх на сённяшні дзень напісана дастаткова шмат даследчыцкай літаратуры, выдадзена зборнікаў дакументаў (тут бясспрэчна аўтарытэтнай можна лічыць ролю Р. П. Платонава. У

рэчышчы беларусізацыі адны «плавалі» вельмі добра, натуральна, тады як іншыя выкладчыкі і студэнты адчувалі яўны дыскамфорт і нават былі вымушаны паціху ці хутка развітвацца з БДУ. На гэты конт адна замалёўка, якую прывёў намеснік старшыні СНК БССР М. М. Карклін падчас абмеркавання справаздачнага даклада рэктара У. І. Пічэты з нагоды пяцігадовай дзейнасці ўніверсітэта. Ён адзначыў непрыймальнасць таго стану, калі студэнты шляхам галасавання абіралі мову навучання. І прапанаваў дастаткова разумную парадыгму руху беларускай сістэмы асветы, у т. л. і БДУ, па шляху беларусізацыі: не праз галасаванне і механічны прымус, а «паступова-плянавым парадкам» [7, с. 199].

Таму ўзяты накірунак на грунтоўнасць вывучэння і ўніверсітэцкага выкладання айчыннай гісторыі быў адным з самых прадуктыўных на шляху асэнсавання беларусамі ўнікальнасці свайго мінулага і непасрэднага яго дачынення да ўсіх абставін (палітычных, эканамічных, культурных і інш.), такіх зменлівых абставін сучаснасці.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Пічэта, В.І. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі / В.І. Пічэта // Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. 1921–1927. Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі. – Менск, 1927. – С. 5–46.
2. Турук, Ф. Университетская летопись / Ф. Турук // Труды Белорусского Государственного Университета в Минске. 1922. № 1. – С. 175–207.
3. Каценбоген, С.З. Белорусский Государственный Университет за 1922–1923 академ. год (Итоги и проблемы) / С. З. Каценбоген // Працы Беларускага Дзяржаўнга Унівэрсытэту. 1923. № 4–5. – С. 230–281.
4. Каценбогин, С.З. Белорусский Государственный Университет за 1921–1922 академ. год (Итоги и перспективы) / С.З. Каценбогин // Труды Белорусского Государственного Университета в Минске. 1922. № 2–3. – С. 326–364.
5. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 1. – Спр. 1773.
6. Хроника БГУ // Труды Белорусского Государственного Университета. 1925. № 8–9–10. – С. 329–335.

7. Хроніка унівэрсытэцкага жыцьця // Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. 1927. № 13. – С. 198–210.